**Дудзевіч, Г.** Ім пашчасціла выжыць / Г. Дудзевіч // Браслаўская звязда. — 2015. — 18 лют. — С. 4.

# ІМ ПАШЧАСЦІЛА ВЫЖЫЦЬ

Шмат лёсаў зламалася, скруцілася ў страшным катле афганскай вайны. Хтосьці знік у ёй, хтосьці застаўся жыць з іншым, ужо не юнацкім светапоглядам. Перад Днём памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў былыя «афганцы» Станіслаў Ставіцкі і Леанід Марозаў наведалі Урбанскі дзіцячы сад – сярэднюю школу. Вучням і настаўнікам цікава было пабачыць людзей, частка жыцця якіх стала ўжо легендай пра мужнасць і гераізм, для якіх вайна была не проста словам, а рэальнасцю. Ветэраны падзяліліся сваімі ўспамінамі пра тыя нялёгкія месяцы службы.

**Станіславу Ставіцкаму** 26 сакавіка 1981 года споўнілася 18 год, а ўжо назаўтра яму прынеслі павестку з ваенкамата пра спецнабор. Хлопец трапіў у Мар’іну Горку, дзе прайшоў курс маладога байца, а далей яго чакаў Афганістан, асобны матацыклетны ўзвод. Тады 18 вагонаў маладых байцоў, яго аднагодкаў, былі накіраваны для абароны маладой дэмакратычнай рэспублікі. Станіслаў Іосіфавіч праходзіў службу ва ўзводзе забеспячэння, вазіў ваду і боепрыпасы. Вада ў горнай пустыннай мясцовасці была рэдкасцю, таму для воінскіх падраздзяленняў яе падвозілі на спецыяльнай тэхніцы. Бывала, ездзілі за 25–30 кіламетраў, часта рызыкуючы жыццём, бо душманы рабілі засады і нападалі на караваны з тэхнікай. Хлопец тройчы ледзь не загінуў. Але яму пашчасціла выжыць. А ў студзені 1983 года за ўдзел у баявой аперацыі па вызваленні савецкіх спецыялістаў Станіслаў быў прадстаўлены да баявой узнагароды, але так і не атрымаў яе.

А **Леанід Марозаў** спачатку прыгадаў першыя словы свайго камандзіра: «Нічога, хлопцы, пагрэемся, на поўдзень жа едзем».

«Яны тады не выклікалі ніякай трывогі, – заўважыў Леанід і прадоўжыў успаміны: – Спачатку былі 2 месяцы вучэбкі ва Узбекістане, а потым – Афганістан. Пра небяспеку не думалі. Думалі пра адказнасць. Батальёну трэба было забяспечваць урадавую сувязь. Па ўсім перыметры рэспублікі было ўстаноўлена абсталяванне для бесперабойнай сувязі Масквы з Кабулам. Яго ахоўвалі і падтрымлівалі ў дзеючым стане. Удзень салдаты капалі акопы, будавалі дзоты, казармы, а для іх будаўніцтва самі рабілі цэглу, Потым гадзіны па чатыры стаялі ў каравуле па ахове аб’ектаў.

Служба была цяжкая. «Духі» часта рабілі завалы, а па сваіх сцежках ноччу з Пакістана перапраўлялі зброю. Салдаты перакрывалі месцы пераправы кара-ванаў. Але на вышыні 4000 метраў хутка пачынаеш задыхацца. Трэба было мець моцнае здароўе, каб не саступаць «духам» у хуткасці і ўменні пераадольваць горныя перавалы.. «Хадзіць на караван» даводзілася часта, і без страляніны там ніколі не абыходзілася. Бывала, што бой ішоў і некалькі гадзін, і некалькі сутак. Загінула шмат сяброў, але памятаю іх усіх».

Воіны-ветэраны пажадалі школьнікам не зведаць у сваім жыцці вайны і зрабілі сумесны фотаздымак на памяць.

**Галіна Дудзевіч,**

***настаўнік Урбанскага дзіцячага сада – сярэдняй школы***